# Беларуская навагодняя паштоўка

Цяжка ўявіць навагоднія ўрачыстасці без віншаванняў у форме маляўнічай паштоўкі з красамоўным надпісам «З Новым годам!». Гэты невялікі, але вельмі важны лісток з пажаданнямі дабра і шчасця ствараў асаблівую святочную атмасферу і нагадваў пра яе праз многія гады. Менавіта таму самыя розныя навагоднія паштоўкі выпускаліся ў вялікай колькасці. З некаторымі з іх «Беларуская думка» знаёміць сваіх чытачоў.




Малюнкі на навагодніх паштоўках разнастайныя, разнапланавыя і разнажанравыя. Найбольш часта – казачныя Дзед Мароз і Снягурка, вясёлы Снегавік, зімовыя пейзажы, задаволеныя дзеці, упрыгожаная цацкамі ёлка, персанажы вядомых мультфільмаў, шампанскае, бліскучыя шары, сняжынкі і запаленыя свечкі. На некаторых паштоўках сустракаецца сімволіка краіны і важныя культурныя аб'екты, а таксама традыцыйныя атрыбуты навагодніх пацех – санкі, лыжы і канькі.

Запатрабаванасць такой паліграфічнай прадукцыі існавала заўсёды. Мабыць, цяперашняму пакаленню моладзі, якое вырасла на электроннай пошце і SMS-паведамленнях, складана зразумець, наколькі важнай была віншавальная паштоўка для іх бабуль і дзядуляў, мам і татаў. Перагружаная паштовая скрыня, з якой тырчалі рознакаляровыя вугалкі паштовак, успрымалася такім жа сімвалам надыходзячага свята, як пах ігліцы і мандарынаў. У тых, каму была адрасавана паштоўка, нараджалася адчуванне свята і шчасця, а цёплыя словы ад родных і блізкіх давалі ўпэўненасці, што ў надыходзячым годзе ўсё будзе добра.

У многіх беларускіх сем'ях звычай дасылаць віншаванні з Новым годам захаваўся і сёння. Сучасныя мастакі, нароўні з простымі сюжэтамі і традыцыйнымі прыёмамі выканання, прапануюць складаныя кампазіцыі і дызайнерскае вырашэнне афармлення паштовак. Сваё важкае слова ў віншавальную традыцыю ўносяць мабільныя сродкі і ўсёахопны Інтэрнэт. Магчыма, з цягам часу музычныя і дынамічныя электронныя выявы выцесняць «старыя добрыя» папяровыя паштоўкі, але хочацца спадзявацца, што гэта адбудзецца не хутка. Бо паштоўкі – не проста яркія карцінкі з пацешнымі сюжэтамі, а, найперш, частка гісторыі краіны і кожнай асобнай сям'і.



























**Падрыхтаваў Аляксандр САМОВІЧ, член Рады Беларускага саюза дызайнераў**